## § 69. Указальныя займеннікі

**442.** Прачытайце. Падбярыце да тэксту загаловак.

У бібліятэку зайшла дзяўчынка і папрасіла беларускія народныя казкі.

— Танечка, ты ж нядаўна брала **гэту** кніжку. З **таго** часу толькі некалькі дзён прайшло, — здзівілася бібліятэкар.

— Там **такія** цікавыя казкі, што я іх на памяць вучу. Пакуль толькі палавіну вывучыла. На жаль, **гэтулькі** твораў за месяц не вывучыш.

— Ты **столькі** казак вывучыла? Малайчына! — пахваліла бібліятэкар.

— Мой тата амаль усю «Новую зямлю» на памяць ведае. А я казкі вучу.

Бібліятэкар зняла з паліцы і дала Тані кніжку беларускіх народных казак «Каток — залаты лабок» *(Паводле В. Гурскага)*.

Вызначце, на што ўказваюць выдзеленыя словы (прадмет, прымету ці колькасць).

Раскажыце пра свае любімыя казкі.

Займеннікі ***гэты, той, такі, гэтакі, столькі, гэтулькі*** ўказваюць на прадметы, іх прыметы і колькасць і называюцца **ўказальнымі**.

Займеннікі ***гэты, той, такі, гэтакі*** змяняюцца, як прыметнікі, па родах, ліках і склонах: *той, тая, тое — тыя; той — таго, таму, тым*. Іх пачатковая форма — мужчынскі род, адзіночны лік, назоўны склон.

Займеннікі ***столькі*** і ***гэтулькі*** роду і ліку не маюць. Яны змяняюцца толькі па склонах: *столькі, стольк, стольк*.

**443.** Запішыце сказы. Вызначце род, лік, склон указальных займеннікаў.

1. Гэты кут люблю ўсім сэрцам, ён — мая Радзіма *(П. Прыходзька)*. 2. Пад цымбалы, пад цымбалы тут Лявоніха скакала! А цяпер пад тыя ж гукі скачуць праўнукі[сл] і ўнукі *(А. Пісьмянкоў)*. 3. Заўсёды мне, сялянка-мова, такі гаючы гоман твой *(В. Жу-*

*ковіч*). 4. Столькі салаўінай[м] музыкі чуваць, што пад тую музыку можна танцаваць! (*Е. Лось*). 5. Лю́бы ты і такі ненаглядны, край, дзе крылы ўзнімаюць буслы (*Я. Жабко*).

Растлумачце напісанне слоў з вялікай літары.

**444.** Прачытайце табліцу. Раскажыце пра асаблівасці скланення займенніка *той (тое, тая, тыя)*.

| Склон | Скланенне займенніка *той (тое, тая, тыя)* | | |
|---|---|---|---|
| Н. | *т* **ой** *т* **ое** | *т* **ая** | *т* **ыя** |
| Р. | *т* **аго** | *т* **ой** (*-ае*) | *т* **ых** |
| Д. | *т* **аму** | *т* **ой** | *т* **ым** |
| В. | як Н. ці Р. *т* **ое** | *т* **ую** | як Н. ці Р. |
| Т. | *т* **ым** | *т* **ой** (*-ою*) | *т* **ымі** |
| М. | (*па*) *т* **ым** | (*па*) *т* **ой** | (*па*) *т* **ых** |

Праскланяйце займеннік *гэты* і прыметнік *багаты*, раскажыце пра асаблівасці змянення. Складзіце два сказы з займеннікамі *гэты* і *той*.

!

Займеннікі ***такі*** і ***гэтакі*** змяняюцца, як прыметнікі з асновай на ***г, к, х*** з націскным і ненаціскным канчаткамі: *такі, такога, такому, такім; гэтакі, гэтакага, гэтакаму, гэтакім* — *сухі, сухога, сухому, сухім*.

У родным і творным склонах адзіночнага ліку жаночага роду ўказальныя займеннікі ***такая*** і ***гэтакая*** могуць мець варыянтныя формы: Р. скл. *такой* (*такое*), *гэтакай* (*гэтакае*); Т. скл. *такой* (*такою*), *гэтакай* (*гэтакаю*).

**445.** З прапанаваных слоў утварыце ўстойлівыя выразы, якія маюць наступныя значэнні: 1) ‘настолькі, так’; 2) ‘не мае значэння’; 3) ‘такім спосабам’.

(*такі*) | ступені | (*такі*) | макарам

да (*такі*) | бяды

Вызначце, у якой форме ўжыты займеннік *такі*.
Складзіце і запішыце сказ з адным выразам (на выбар).



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**446.** Параўнайце формы прыметніка і займенніка. Зрабіце вывад пра асаблівасці змянення займенніка *столькі*.

| Склон | Скланенне займенніка *столькі* | |
|---|---|---|
| Н. | *стольк***і** | *дараг***ія** |
| Р. | *стольк***іх** | *дараг***іх** |
| Д. | *стольк***ім** | *дараг***ім** |
| В. | як Н. ці Р. | |
| Т. | *стольк***імі** | *дараг***імі** |
| М. | *(пры) стольк***іх** | *(пры) дараг***іх** |

Праскланяйце словазлучэнне *гэтулькі майстроў*. Складзіце дыялог са словамі *гэтакі* і *гэтулькі*.

**447.** Прачытайце тэкст, раскрываючы дужкі. Дзе і калі вам можа спатрэбіцца перакладны слоўнік? Падбярыце загаловак да тэксту.

Перакласці з б..ларускай мовы на рускую вам дапаможа б..ларуска-рускі слоўнік. *(Гэты)* даведнікам зручна карыстацца. У *(такі)* слоўнік.. у алфавітным парадк.. разме..чаны найбольш ужывальныя[м] словы.

У б..ларуска-рускага слоўнік.. ёсць «брат» — руска-б..ларускі слоўнік. Словы ў *(гэты)* даведнік.. падад..ены ў *(той)* самым парадк.., што і ў беларуска-рускім слоўнік.. .

Пас..бруйце з *(гэты)* п..ракладнымі слоўнікамі. Яны ж дапамаглі *(столькі)* навуч..нцам! Хутка і вы за..важыце, што ваша ма..ленне стала больш прыгожым і дасканалым *(Паводле часопіса «Вясёлка»)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і ўжываючы словы ў дужках у патрэбнай форме. Вызначце род, лік, склон займеннікаў, падкрэсліце іх як члены сказа.

Складзіце схему апошняга сказа.

**448.** Прачытайце. Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову.

### Электромобили от белорусских учёных

Наша страна активно развивает производство электротранспорта. Активно работает в этом направлении Национальная академия

наук Беларуси. В 2017 году белорусские учёные представили первый экземпляр электромобиля. За основу такой модели они взяли автомобиль Geely, который тоже производят в Беларуси. Учёные переработали его, и в результате получился электромобиль белорусского производства.

Первый экземпляр этого электрокара мог проехать 150 км на одном заряде аккумулятора. Такой электромобиль развивал скорость до 110 км/ч. Сегодня заряда аккумулятора хватает на восемь часов работы некоторых электромобилей. У белорусских учёных много планов на создание электрокаров новых моделей *(По В. Богуцкому)*.

**Слоўнік**

производство — *вытворчасць*
направление — *кірунак*
представить — *прадставіць*
электромобиль — *электрамабіль*
производить — *рабіць*
переработать — *перапрацаваць*
создание — *стварэнне*

Чаму наша краіна зацікаўлена ў развіцці электратранспарту?

Запішыце па-беларуску сказы, у якіх ёсць указальныя займеннікі.

Вызначце, у якой форме ўжыты займеннікі ў сказах. Падкрэсліце іх як члены сказа.

Уявіце, што вы прысутнічаеце на выставе «Беларусь інтэлектуальная». Якія пытанні вы задасце распрацоўшчыкам беларускіх электракараў?

## § 70. Азначальныя займеннікі

**449.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.

Герб і сцяг лічацца ва **ўсіх** краінах **самымі** важнымі сімваламі народа. Яны перадаюць не **любу́ю** сімволіку, а толькі ўласцівую ім. **Усе** сцягі і гербы павінны істотна адрозніваццa ад **іншых** падобных сімвалаў. **Кожная** дэталь сцяга і герба нашай дзяржавы дае наглядныя і ў той жа час важныя звесткі пра нашу краіну, пра **сам** народ *(Паводле Э. Сурначова)*.

Калі адзначаецца Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь?

Вызначце род, лік і склон выдзеленых займеннікаў.

Якую інфармацыю пра нашу краіну, беларускі народ нясуць герб і сцяг Рэспублікі Беларусь?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі